## КАЛІ Б ІМ БЫЎ Я***

1) У мэтах стабілізацыі грамадзтва вынес бы на рэфэрэндум праект новай дзяржаўнай сымболікі: зялён-чырвона-зялёны сьцяг, а таксама мадыфікаваны герб “Пагоня” (замест гэтага рыцара іржавага — будзёнавец з шабляю альбо міліцыянт з французкім батонам на матацыкле).

2) Прапанаваў бы аб’яднаць усе палітычныя партыі ў дзьве: Жалезную і Чыгунную, а каб не сварыліся — няхай пасьля кожных выбараў мяняюцца назвамі і штаб-кватэрамі.

3) Трэба рэфармаваць выбарчую сыстэму такім чынам, каб кожны чалавек меў права падаць за ўсенароднага кандыдата ад 1 да 4 галасоў — калі будзе жаданьне прагаласаваць абедзьвюма рукамі альбо рукамі й нагамі (пратэзы ўлічваюцца).

4) Заснаваў бы новае шляхецкае саслоўе з усіх тых, хто сёньня размаўляе па-беларуску і мае трохі ўласнае зямлі — як мінімум, гаршчок для кветак.

5) Варта падумаць пра новы назоў для краіны. Можна было б назваць яе Менская Русь, Крывія, Балтаславія, Паўднёвая Літва... Зьмяніць назоў ня так ужо й складана. Але спачатку трэба зьмяніць нашыя прозьвішчы такім чынам, каб яны перагукаліся з новым назовам дзяржавы. Напрыклад, у выпадку Крывіі можна прапанаваць грамадзянам прозьвішчы Крыве-Крывейтэ, Крылоў, Крайсьлер-Імпэрыял і г.д. Агульны корань дапаможа падаткаплацельшчыкам адчуць сябе адным племем, а прэзыдэнта — правадыром.

6) Трэба, нарэшце, рэфармаваць правапіс. Напрыклад, калі Беларусь мае стацца цэнтрам яднаньня славянскіх народаў, можна замяніць кірыліцу (прынамсі, у афіцыйных паперах) на глаголіцу. Калі ж галоўнаю мэтай “беларускага шляху” мы абярэм ператварэньне нашае рэспублікі ў сусьветны цэнтар харэаграфіі, то варта было б памяняць кірыліцу на сыстэму “скачучых чалавечкаў”, апісаную прафэсарам Конан-Дойлем у манаграфіі “Конан-барбар”.

7) СССР можна аднавіць і ў “адной асобна ўзятай” рэспубліцы — у выглядзе фэдэратыўнае дзяржавы (падзелім Беларусь на 15 саюзных рэспублік, адпаведных тым, што існавалі ў нашай магутнай радзіме).

8) Зь іншага боку, някепска б стварыць у межах Беларусі Новую Эўропу з уласнымі Францыяй, Рымам, Радай Эўропы, швайцарскімі банкамі і г.д.

9) Ёсьць толькі адзін надзейны спосаб нарэшце аб’яднаць грашовыя сыстэмы Расеі і Беларусі: трэба назьбіраць у абедзьвюх краінах аднолькавую колькасьць нацыянальных банкнотаў, а потым склеіць іх адпаведна наміналам.

10) Купіў бы ў Расеі Сыбір, а калі застануцца грошы — яшчэ й Каліфорнію ў ЗША.

11) Калгасныя палеткі трэба засеяць лесам, каб пакласьці канец “бітвам за ўраджай”: нашмат выгадней экспартаваць драўніну й набываць збожжа за мяжою. У лесе можна вырошчваць прафэсійных партызанаў на экспарт, грыбы, лекавыя зёлкі.

12) Перайменаваў бы Лысую гару пад Менскам у пік Лукашэнкі — у гонар першага прэзыдэнта краіны.

13) Зацікавіць выбаршчыкаў у тым, каб жылі на нашай зямлі і далей, можна, напрыклад, грашыма: трэба гарантаваць усім, чыё існаваньне

страціла ўласны сэнс, прыстойны штомесячны аклад за самое жыцьцё (з прэміямі доўгажыхарам).

14) Наладзіў бы ў Менску й Шклове пару Алімпійскіх гульняў: адны — для веснавых, другія — для восеньскіх відаў спорту.

15) Трэба закласьці пад усю паверхню Беларусі магутны магнэс, каб прыцягваць з космасу мэтэарыты і папаўняць такім чынам дзяржаўныя запасы жалеза й рэдкіх элемэнтаў, а галоўнае — каб натаўскія танкі ў выпадку вайны прыліпалі да зямлі і ня здолелі прайсьці праз нашую тэрыторыю ў братнюю Расею.

16) Пабудаваў бы тысячу гор і цясьнінаў, каб патрыётам было дзе хавацца ад карнікаў падчас акупацыі, а ў мірны час з поўначы не даходзілі арктычныя вятры. Перайменаваў бы возера Нарач у мора, каб Беларусь, нарэшце, сталася марскою дзяржавай.

17) Мне падабаецца праграма Субтрапічнай партыі Расеі — для пачатку яе можна было б ажыцьцявіць у нас:

— Для зьмяншэньня энэргазатратнасьці эканомікі зьнізіць тэмпэратуру кіпеньня вады да 50 градусаў.

— У бананавай рэспубліцы павінны расьці бананы (і какосы).

— Сярэднегадавую тэмпэратуру паветра ўсталяваць на ўзроўні 20 градусаў, можна вышэй.

18) Можна перасунуць нашую зямлю бліжэй да тропікаў, каб буслам ня трэба было кожную восень лётаць у вырай. А яшчэ лепш прыладзіць пад краіну колы і езьдзіць на ёй у адпачынак усім разам.

19) Даўно падазраю, што многія матэрыкі й акіяны яшчэ не адкрытыя, але знайсьці іх мы з вамі ня здолеем, пакуль будзем верыць мапам і глёбусам, уся паверхня якіх ужо кім-небудзь купленая. Яшчэ не адкрытыя ні Заходні полюс, ні Ўсходні, хоць усім відавочна: яны павінны быць дзесьці там, дзе ўзыходзіць і заходзіць сонца.

20) Згодны прызначыць усё дарослае насельніцтва краіны сваімі віцэ-прэзыдэнтамі. Зьмяніў бы Канстытуцыю такім чынам, каб усе грамадзяне па дасягненьні паўналецьця аўтаматычна прызначаліся б дэпутатамі, амбасадарамі, міністрамі і г.д. А потым можна абвесьціць усенародныя выбары грамадзяніна, свабоднага як дзікі конь ад дзяржаўных пасадаў.

---

**** Тэкст пэрформансу на навуковай канфэрэнцыі "Беларусь і Ўкраіна: вынікі стагодзьдзя"(1997).*